

З ЮБІЛЕЕМ!

23 кастрычніка 2026 года свой прыгожы юбілей святкуе наша калега па пісьменніцкай арганізацыі, таленавітая беларуская паэтка, празаік Ірына Войтка. Ірына Антонаўна – педагог, асветнік, грамадскі дзеяч, сапраўдны літаратурны лідар, – шмат гадоў узначальвае Слонімскае раённае літаратурнае аб'яднанне імя Анатоля Іверса. Пераможца літаратурнага конкурсу ў рамках Рэспубліканскага фестывалю «Вытокі». Яе творы можна прачытаць на старонках рэспубліканскіх і рэгіянальных літаратурных выданняў, у шматлікіх зборніках і альманахах. Мы можам ганарыцца прысутнасцю ў нашых шэрагах такога яркага, самабытнага аўтара і такой мілай, абаяльнай жанчыны. Дарагая Ірына Антонаўна! Віншуем Вас з юбілеем, жадаем здароўя і шчасця, міру і душэўнай гармоніі, натхнення і радасці ад кожнага пражытага дня. Любім, шануем Вас і абдымаем...



Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Гродна – Слонім